*– На канале преобладают программы о музыке, литературе. Не задумывались ли о создании подробной программы о кино?*

– Нет, театр мне намного интереснее.

*– Что привлекает вас в работе? И что огорчает?*

– Знаете, в год 20-летия канала не хотелось бы говорить о том, что огорчает. Все прекрасно!

*– Ваши пожелания каналу «Культура» в год 20-летия.*

– Моим коллегам и каналу «Культура» я желаю крепкого здоровья и вдохновения. Каналу «Культура» – дальнейшего процветания и успешного следования по выбранному курсу. Напомню: «Мы выбіраем вечныя каштоўнасці».

## «ЗАХАВАННЕ І РАЗВІЦЦЁ ЗДАБЫТКАЎ ПАПЯРЭДНІКАЎ, НА МОЙ ПОГЛЯД, З'ЯЎЛЯЕЦЦА СУТНАСЦЮ ПАНЯЦЦЯ КУЛЬТУРА»: КАЦЯРЫНА АГЕЕВА

**Т. І. Пpановіч**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

*– Беларускія радыёслухачы былі знаёмы з другой праграмай Беларускага радыё – яна называлася «Крыніца» і таксама ўтрымлівала культурны кантэкст. Іншымі словамі, радыё «Культура» – праект, які ўзнік не на пустым месцы. Ці спатрэбіліся нейкія папярэднія традыцыі, а можа, для новага будынка давялося закладваць новы падмурак?*

**–** Вывучэнне, захаванне і развіццё традыцый, здабыткаў папярэднікаў, на мой погляд, з'яўляецца сутнасцю паняцця «культура». Таму новы радыёканал стаў пераемнікам і паслядоўнікам лепшых традыцый літаратурна-драматычнай, музычнай і дзіцячай рэдакцый Беларускага радыё. У прыватнасці, створаныя гэтымі калектывамі на працягу дзесяцігоддзяў фонды радыё заўсёды займалі годнае месца ў эфіры «Культуры», а ў першым сезоне навогул складалі асноўную частку вяшчання і дазволілі дапрацаваць канцэпцыю, сабраць каманду і стварыць актуальныя праекты для новага канала.

Іншая справа, што спецыялізаваных радыёканалаў, на якіх прысутнічала б выключна культурная тэматыка, у той час на постсавец-

кай прасторы не было. Тут мы сталі першапраходцамі. Каб зрабіць радыёканал адной тэматыкі разнастайным, дынамічным і сучасным, калектыву давялося шмат папрацаваць. Ад сезона да сезона эфір канала ўдасканальваўся: у межах паняцця «культура» пашыраўся дыяпазон тэм, выкарыстоўваліся самыя сучасныя формы падачы матэрыяла. «Культура» выйшла па-за межы студыі і стала не проста актыўным удзельнікам культурных падзей у краіне, але часам і іх ініцыятарам. Дарэчы, праз некалькі гадоў пасля нас падобны канал стварылі ва Украіне і звярталіся па вопыт да нас.

*– Вы сталі першым дырэктарам радыё «Культура», маючы салідны прафесійны багаж: працавалі ў аддзеле культуры газеты «Мінская праўда», на Першым канале радыё вялі аўтарскую праграму «Альтанка», ваш «Спажывецкі кошык» на Беларускім тэлебачанні ў свой час быў адной з самых папулярных перадач. Ці адчувалі сябе гатовай да стварэння новага радыёканала? З чаго пачалі сваю работу?*

– Арганізатарскі вопыт я набыла яшчэ на тэлебачанні, дзе была не толькі адным з аўтараў папулярнага праекта, але і яго арганізатарам і кіраўніком. Мне спадабалася, што з дапамогай добрай каманды можна ўвасобіць адначасова многа ідэй. Прафесійны ўзровень калектыва тагачаснага радыё я добра ведала і ацэньвала вельмі высока. Таму прапанова кіраўніцтва радыё арганізаваць новы радыёканал мне падалася цікавай і рэальнай. Пачала, вядома ж, са стварэння каманды.

*– «Мы за вечныя каштоўнасці» – слоган радыёканала «Культура» сёння як ніколі актуальны. Ці складана ў наш час прытрымлівацца гэтай пазіцыі – абаронцы культурных каштоўнасцяў?*

– Калі арганізоўваўся і пачынаў вяшчанне наш канал, актуалізавалася, так бы мовіць, камерцыялізацыя сродкаў масавай інфармацыі. Іншымі словамі, у тым ліку і ад нас патрабавалі зарабляць грошы з дапамогай рэкламы. Памятаю ўшчуванні аднаго з радыйных начальнікаў: ваш канал павінен гучаць з кожнай «крутой тачкі». Аднак высокага рэйтынгу, каб прыцягнуць рэкламадаўцаў, у «Культуры» не было: ва ўсе часы ў любым грамадстве прыхільнікаў высокага мастацтва, глыбокай літаратуры і інтэлектуальных разважанняў былі адзінкі ў параўнанні з арміяй спажыўцоў прадуктаў масавай культуры. Так што абараняцца нам даводзілася ўвесь час. Дапамагала тое, што нашая тэматыка і ўзровень праектаў цудоўна

дапаўнялі і ўпрыгожвалі шматлікія справаздачы Беларускага радыё аб зробленай рабоце. Дарэчы, неўзабаве спонсар у канала «Культура» з'явіўся. Фірма захопленага ідэяй захавання культурных каштоўнасцяў мецэната падтрымлівала шэраг праектаў і дазволіла рэалізаваць некалькі сацыяльна-значных ідэй. Нам прадастаўляліся прызы для конкурсаў творчасці, падарункі для арганізацыі свята ў дзіцячым доме. Удзельнічалі нашы партнёры таксама ў фінансаванні выязных канцэртаў сталічных зорак, якія ў фармаце творчых сустрэч калектыва канала са слухачамі праходзілі ў розных населеных пунктах краіны.

*– Не аднойчы слухала ў прамым эфіры канала праграму «Дыялогі пра культуру», аўтары якой вялі глыбокія і захапляльныя гутаркі, у тым ліку пра мастацтва. Сярод іх была і наша калега, загадчыца кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі, кінакрытык Людміла Саянкова. Як вам удалося займець такіх прафесіяналаў у «калекцыю» радыёканала «Культура»?*

– Сапраўды, поплеч з паважанай Людмілай Пятроўнай сярод пазаштатных аўтараў канала былі мастацтвазнаўцы Алег Ойстрах, Мікалай Паграноўскі, Юрый Іваноў, тэатразнаўца Людміла Грамыка, кампазітар Сяргей Пукст і многія іншыя вядомыя ў краіне асобы. Адзначу, што фінансавыя магчымасці канала былі больш чым сціплыя, каб усур'ёз заахвоціць знаных аўтараў. Але адзін з нашых актыўных пазаштатнікаў неяк сказаў: «Якое шчасце, што ёсць эфірная прастора, у межах якой можна агучыць важныя рэчы, выказаць свае меркаванні, падзяліцца ведамі, сустрэць аднадумцаў, у рэшце рэшт». Думаю, менавіта гэта прыцягвала да канала творчых інтэлектуалаў.

*– Некалькі разоў з першакурснікамі факультэта журналістыкі былі на экскурсіі на радыё «Культура». Студэнты заўсёды адзначалі добразычлівую, творчую атмасферу. Стварыць калектыў аднадумцаў і ў той жа час яркіх індывідуальнасцяў нялёгка. Як «расцілі» калектыў? Пра каго з калег хацелася б расказаць?*

– Калектыў сабіраўся ў працэсе развіцця канала. Першымі запрасіла радыйшчыкаў са стажам, многія з якіх у свой час закладвалі літаратурна-музычныя фонды радыё і маглі арганізаваць трансляцыі іх матэрыялаў у эфіры новага канала. З часам яны стварылі на базе фондаў шэраг папулярна-асветніцкіх музыказнаўчых і літара-

туразнаўчых праектаў. І сёння з удзячнасцю прыгадваю падтрымку літаратурнага журналіста Галіны Шаблінскай, да якой у эфір прыходзілі самыя знаныя беларускія творцы. Вельмі дапамагла выбудаваць музычную структуру эфіра музыказнаўца Вольга Смоліч. Самыя папулярныя беларускія музыканты на шляху да славы не міналі студыю музычнага каментатара Таццяны Песнякевіч. У вячэрнім музычным эфіры панавала салодкагалосая аматарка добрага рока і джаза Марына Ціхамірава. Не магу не ўзгадаць і музычнага рэдактара з самым, бадай, вялікім радыйным стажам Валянціну Прыбаву. Яна, здаецца, стаяла ля самых вытокаў радыйных фондаў, любую фанаграму магла знайсці без картатэкі і кампутара. Дарэчы, па адукацыі Валянціна Паўлаўна – журналіст. Журналіст, які знайшоў сваю тэму і застаўся верным ёй усё творчае жыццё.

Сучаснае гучанне «Культуры» надалі маладыя супрацоўнікі, у першую чаргу выпускнікі факультэта журналістыкі БДУ, якія прыйшлі да нас з жаданнем працаваць менавіта ў гэтай тэматыцы. Яны стварылі дынамічную службу навін культуры, прапанавалі шэраг актуальных праектаў, прысвечаных сучаснай культуры, літаратуры і мастацтву. Пры ненадакучлівым кантролі і карэкціроўцы кожнаму «навабранцу» давалі магчымасць знайсці сваю тэму, паспрабаваць розныя формы падачы матэлыялу і распрацаваць аўтарскі праект, у якім яны змаглі б поўнасцю раскрыць свае здольнасці.

З задавальненнем прыгадваю, як на вачах развіваліся выпускніцы журфака Наталля Капусціна, Святлана Колмак, Кацярына Грыцэнка, Марыя Дуброўская, Юлія Церахава. Выдатную аўтарскую краязнаўчую праграму стварала філолаг Наталля Буландо. У сапраўднага знаўцу і папулярызатара сучаснага мастацтва з часам вырасла гісторык Іна Наркевіч.

Асобна прыгадаю траіх галоўных удзельнікаў нашых так званых «мазгавых штурмаў».

Недзе напачатку дзейнасці канала ў калектыў прыйшоў выпускнік універсітэта культуры і мастацтваў малады рэжысёр Уладзімір Трапянок (цяперашні дырэктар канала). Уладальнік цудоўнага голаса, ён з часам праявіў сябе як выдатны арганізатар: кіраваў аддзелам навін культуры і актыўна ўдзельнічаў у арганізацыі пазаэфірных акцый канала. У прыватнасці ён каардынаваў амаль усе выязныя акцыі канала: сустрэчы са слухачамі, удзел у культурных мерапрыемствах сталіцы і рэгіёнаў.

Адданы прыхільнік музыкі, выпускнік Беларускай акадэміі музыкі кампазітар Віктар Кісцень здолеў згуртаваць вакол канала меламанаў, якія падтрымлівалі ўсе нашыя пачынанні. Арганізаваныя ім творчыя сустрэчы слухачоў з беларускімі музыкантамі ў прамым эфіры Першай Студыі Дома радыё сталі адным з самых папулярных праектаў канала. Менавіта на ім адбылася прэзентацыя першай набытай краінай скрыпкі Гварнеры. Пазней беларуская скрыпачка Улада Беражная грала на ўнікальным інструменце ў фінале Міжнароднага радыйнага конкурса маладых выканаўцаў у Браціславе, які трансліраваўся ў эфіры канала. Віктар Кісцень займаўся да таго ж папаўненнем фондаў радыё новымі музычнымі матэрыяламі, а таксама рэгулярна арганізоўваў запіс і адпраўляў у фонд Еўрапейскага вяшчальнага Саюза лепшыя ўзоры сучаснай беларускай музыкі. Сёння ён узначальвае калектыў фанатэкі Беларускага радыё.

У крэатыўным касцяку калектыву асобае месца займала выпускніца факультэта журналістыкі Таццяна Гулевіч. Яна здолела арганізаваць штодзённы праект канала «Мэры Попінс». Пад яе кіраўніцтвам ствараўся не толькі найцікавейшы эфір для дзіцячай аўдыторыі, сіламі творчай групы арганізоўваліся шматлікія пазаэфірны мерапрыемствы: конкурсы юных талентаў, дабрачынныя акцыі. Менавіта на гэтым праекце праходзіла вучэбная практыка многіх студэнтаў журфака.

Пераходам на новы ўзровень вяшчання стала супрацоўніцтва з пазаштатнымі аўтарамі, вядомымі ў краіне творчымі інтэлектуаламі – экспертамі, крытыкамі, якія стваралі аналітычны кантэнт канала. Іх удзел у эфіры не толькі ўзбагаціў і паглыбіў яго змест, але і паспрыяў творчаму росту маладых супрацоўнікаў, якія стараліся раўняцца на масцітых калег па эфіры.

*– Радыё «Культура» – гэта не толькі радыёэфір. Гэта, напэўна, яшчэ і цікавыя жывыя праекты. Якімі з іх асабліва ганарыцеся?*

– Шмат чым ганаруся. І культурнымі дэсантамі ў абласныя гарады, і ўдзелам у Першым Мінскім трыенале сучаснага мастацтва, і жывымі трансляцыямі канцэртаў, і мерапрыемствамі дзіцячага праекта. А самай памятнай, бадай, стала першая сустрэча калектыва канала са слухачамі, калі мы ўпершыню адчулі, што наш канал адбыўся, заваяваў аудыторыю, упрыгожыў жыццё і падтрымаў у перакананнях мноства людзей.

Адбылася яна ў 2009 годзе. У той вечар зала музея Максіма Багдановіча, дзе праходзіла мерапрыемства, была перапоўнена. У цэнтр увагі патрапілі не толькі нашы знакамітыя аўтары, але і таленавітая моладзь канала, якую, аказваецца, ужо добра ведалі і цанілі слухачы. Пазней сустрэчы са слухачамі сталі традыцыйнымі. Яны адбываліся на розных культурных пляцоўках краіны: у філармоніі, у выставачных залах, у музеях.

*– Практычна 15 год вы ўзначальвалі радыёканал. Ці заставаўся час для ўласнай творчасці? Якія тэмы вам асабліва цікавыя?*

– На пасадзе дырэктара, на жаль, на асабістую творчасць часу не хапала, пісала, бадай, толькі справаздачы. Крэатывіла падчас стварэння новых праектаў і распрацоўкі пазаштатных акцый. У вольныя хвіліны дапамагала сваім супрацоўнікам, як магла. Напрыклад, падчас правядзення так званага «Інтэлектуальнага марафона», які карыстаўся папулярнасцю беларускіх знаўцаў, прымала па тэлефоне адказы на пытанні. Ганаруся фактам, што для рубрыкі «Бестсэлер» няблага скараціла «Ганну Карэніну». Актрыса, якая выканала скарочаны раман у прамым эфіры, адзначыла, што на яе памяці гэта была самая ўдалая рэдактура. Мне пашчасціла пабыць журналістам пасля сыхода на заслужаны адпачынак. Супрацоўнічала з некалькімі выданнямі, за цыкл артыкулаў на тэму беларускай гісторыі і культуры ў часопісе «Навука і інавацыі» стала пераможцай конкурса Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

*– Кацярына Іванаўна, вы журналіст у другім пакаленні. Ваш бацька, Іван Мінавіч Агееў узначальваў газету «Мінская праўда», доўгі час працаваў на Беларускім радыё. Якія ўрокі бацькі вам спатрэбіліся ў прафесійнай дзейнасці?*

– Мой бацька нарадзіўся ў сялянскай сям'і, вывучыўся на настаўніка рускай мовы і літаратуры, да журналістыкі прыахвоціўся падчас вайны: пісаў паміж баямі заметкі ў франтавую прэсу. Пазней вучыўся новай прафесіі на аддзяленні журналістыкі і ўсё жыццё займаўся самаўдасканаленнем. Яго журналісцкі стыль прызнавалі бездакорным. Калегі ўзгадвалі яго як вельмі чалавечнага начальніка і далікатнага рэдактара. Імкненне да развіцця і павага дя людзей – галоўныя ўрокі майго таты.

*– Радыё «Культура» – салідная частка вашага жыцця. Якія духоўныя набыткі вы самі зрабілі за гэтыя гады? Якія падзеі запомніліся, людзі?*

– Гэтыя гады былі ў мяне вельмі актыўнымі, эмацыйна насычанымі і цікавымі. Самае каштоўнае, гэта былі стасункі з інтэлектуальнай элітай краіны, якая прапісалася ў студыі «Культуры». Гэта пашырыла мой кругагляд, прынесла новыя веды па сучаснай музыцы, жывапісу, загартавала погляды, парадзіла новыя ідэі. З задавальненнем і ўдзячнасцю ўспамінаю многіх нашых пазаштатных аўтараў і гасцей канала, якія дапамаглі зрабіць яго з'явай культурнага жыцця краіны.

У арсенале маіх уражанняў і дзве зусім розныя, але вельмі важныя сустрэчы. Недзе напачатку вяшчання канала па дарозе са Стакгольма ў Сідней да нас у эфір завітаў сусветна вядомы музыказнаўца з беларускімі каранямі Міхаіл Казіннік, які музычную адукацыю атрымаў у свой час у Беларусі. Сваёй неўтаймавальнай энергетыкай і дыяпазонам ведаў ён нібыта ўзарваў эфір канала-дэбютанта, натхніў і зарадзіў упэўненасцю і энергіяй малады калектыў. З цеплынёй узгадваю таксама нашага першага фаната з глыбінкі. Жывёлавод-меламан з Буда-Кашалёўскага раёна прыехаў да нас, каб паглядзець на сваіх любімых вядучых. Ён зняў свой доўгі кажух з водарам веснавой вёскі, і мы правялі для яго экскурсію па студыі, мантажнай, фанатэцы. Тады мы зразумелі, што наша аўдыторыя значна шырэйшая, чым нам уяўлялася.

– *У радыё «Культура», безумоўна, склалася свая аудыторыя, многа па-сапраўднаму адданых слухачоў, якія самі выбіраюць «вечныя каштоўнасці». Што трэба для таго, каб культура стала патрэбай не для выбраных – для большасці?*

– Каб свядома выбіраць, трэба добра ведаць. Таму, на мой погляд, задача такого спецыялізаванага канала, як радыё «Культура» – дэманстраваць усё багацце культурнай палітры, каб туды можна было акунуцца і зрабіць выбар менавіта на карысць культуры.